# ЯК ПАЛЕПШЫЦЬ ЖЫЦЦЁ ЛЮДЗЕЙ З АСАБЛІВАСЦЯМІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вельмі важна забяспечыць для іх бесперашкодны доступ да жылых аб'ектаў, як і да аб'ектаў сацыяльных, інжынерных, транспартных, да ўсёй інфраструктуры ўвогуле. Для гэтага трэба заканадаўча адрэгуляваць парадак уладкавання безбар'ернага асяроддзя ў дамах і кватэрах, дзе жывуць інваліды і сем'і, якія маюць у сваім складзе інвалідаў, а таксама ўладкавання безбар'ернага асяроддзя ў месцах агульнага карыстання.

Бо нярэдкія выпадкі, калі чалавек на калясцы падняўся па пандусе, але ўвайсці ў будынак не можа. Чаму? Альбо шырыня дзвярэй не адпавядае нарматывам, альбо аказваюцца яшчэ прыступкі, па якіх узлезці чалавек з інваліднасцю не ў стане. Так, у нашым заканадаўстве ёсць усе адпаведныя нормы, але практыка паказвае, што часта ўзнікае шмат пытанняў, асабліва гэта датычыцца ўладкавання безбар'ернага асяроддзя ў месцы пражывання інваліда. Напрыклад, у нас у многіх будынках ліфты чамусьці пачынаюцца з другога паверха і пандусаў да іх няма. Мы стараемся выправіць памылкі будаўніцтва мінулых гадоў, але гэта адбываецца з вялікай цяжкасцю. І чалавеку з інваліднасцю часта даводзіцца прыкладаць шмат намаганняў, каб скарыстацца сваім правам на даступнае асяроддзе.

Або яшчэ прыклад: у многіх мінскіх гасцініцах ужо абсталяваны нумары для людзей з інваліднасцю. Але, як адзначыў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны, грамадскі кантроль выявіў, што толькі малая іх частка адпавядае тым патрабаванням, якія б забяспечвалі бесперашкодны доступ для людзей з інваліднасцю. Таму неабходна прапісаць пытанні кантролю і адказнасці за невыкананне ўстаноўленых патрабаванняў па стварэнні безбар'ернага асяроддзя.

А што такое сітуацыйная дапамога? У законе трэба распісаць, што гэта значыць, прапісаць нормы і ўрэгуляваць парадак яе аказання чалавеку з любым відам інваліднасці. Якую канкрэтна ён будзе атрымліваць дапамогу? Якой будзе адказнасць за неаказанне або неналежнае аказанне такой дапамогі?

Калі ўзяць сітуацыю з адаптацыяй і сацыяльнай рэабілітацыяй людзей з інваліднасцю, то іх немагчыма назваць паўнавартаснымі, калі ў выніку інваліды не змогуць працаваць. Калі чалавек хоча працаваць, грамадства павінна забяспечыць яму гэтае права. Для гэтага існуе механізм квот. Калі гэта будзе прапісана заканадаўча, кіраўнікі прадпрыемстваў будуць бачыць і сваю асабістую адказнасць за сацыяльную адаптацыю інвалідаў: ёсць пэўныя квоты і столькі чалавек з інваліднасцю яны павінны прыняць на працу. І трэба абсталяваць працоўныя месцы для гэтых людзей, стварыць неабходную інфраструктуру, якая будзе забяспечваць магчымасць руху і г. д.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Увогуле, ужо зразумела, што ў гэтай працы павінна ўдзельнічаць усё грамадства, а не толькі адно Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

* * *

Важныя новаўвядзенні, якія датычацца людзей з інваліднасцю, плануе ўнесці ў сваю працу Міністэрства аховы здароўя. Ведамства зараз пачынае работу над пілотным праектам па вызначэнні інваліднасці па новым крытэрыі. Разам з трыма групамі інваліднасці плануецца вызначаць яшчэ і працэнт ступені выяўленасці парушэння функцый арганізма. Ён будзе вар'іравацца ад 10 да 100 працэнтаў з крокам у 10 працэнтаў, што, на думку многіх спецыялістаў, дасць магчымасць больш аб'ектыўна падыходзіць да ўстанаўлення інваліднасці. У Міністэрстве аховы здароўя плануюць адпрацаваць гэта новаўвядзенне ў некалькіх раёнах краіны, пры станоўчых выніках яно будзе замацавана нарматыўна, заявіла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі і экспертызы — начальнік упраўлення медыцынскай экспертызы Ірына КІРЭЕВА.**

Дыскусійным аказалася пытанне, звязанае з увядзеннем адказнасці чалавека з інваліднасцю за ўхіленне і адмову ад рэалізацыі індывідуальнай праграмы рэабілітацыі. Міністэрства аховы здароўя прапануе такое новаўвядзенне ў сувязі з вельмі высокім працэнтам невыканання праграмы прафесійнай рэабілітацыі інвалідаў. Зразумела, што ў ведамстве ёсць важкія аргументы для такога рашэння. Але свае аргументы выказалі і ўдзельнікі пасяджэння. Так, **старшыня Рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў Яўген ШАЎКО** задаўся пытаннем аб правах пацыента, у якіх запісана, што кожны грамадзянін мае права адмовіцца ад лячэння. А **старшыня Беларускага таварыства інвалідаў Уладзімір ПАТАПЕНКА** адзначыў, што пры складанні гэтай праграмы трэба ацэньваць не толькі медыцынскія, але і сацыяльныя фактары. Як і **дырэктар Офіса па правах людзей з інваліднасцю Сяргей ДРАЗДОЎСКІ**, які заявіў, што МРЭК вызначае праграму рэабілітацыі зыходзячы ў асноўным з дыягназу і практычна не ўлічвае сацыяльнае асяроддзе, у якім жыве чалавек: вёска гэта ці горад, ёсць там нейкая інфраструктура ці няма... «Мы пакуль ідзём па медыцынскім шляху, калі ацэньваем толькі парушэнні здароўя і не ацэньваем працэнт уключанасці чалавека ў навакольнае жыццё, — заявіў Сяргей Драздоўскі. — Гэта важна, але гэтага недастаткова. Таму што бывае, што фармальна чалавек быццам бы не падыходзіць пад азначэнне інваліда, але ён жыве ў стане інваліднасці, таму што навакольнае асяроддзе навязвае яму гэты стан. І гэтую праблему трэба вырашаць...»

Гэта, дарэчы, асноўнае пытанне, якое стаіць перад спецыялістамі і нашым грамадствам у цэлым: як перастаць бачыць у інваліднасці толькі медыцынскую праблему і зразумець, што гэта ў першую чаргу праблема сацыяльная? Важным момантам з'яўляецца і тое, што **да самага апошняга часу ў Беларусі чалавек з інваліднасцю разглядаўся як аб'ект сацыяльнай падтрымкі, але цяпер, з прыняццем і ратыфікацыяй Канвенцыі ААН аб правах інвалідаў, сітуацыя кардынальна змянілася, ператвараючы чалавека з інваліднасцю з аб'екта сацыяльнай абароны ў паўнапраўнага ўдзельніка адносін па выкананні і рэалізацыі ўласных правоў.**

✓ Усяго ў Беларусі налічваецца 564 967 чалавек з інваліднасцю (па стане на 1 студзеня 2018 года). З іх 87 930 маюць інваліднасць 1 групы, 265 510 — 2 групы і 180 522 — 3 групы. У краіне таксама ёсць 31 005 дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў.

✓ Больш за ўсё людзей з інваліднасцю ў Мінску (124 681 чалавек) і Гомельскай вобласці (91 398 чалавек). Менш за ўсё — у Віцебскай вобласці (58 744).

## Незвычайны праект



**У нашай краіне стартаваў незвычайны сацыяльны праект: яго арганізатары прапануюць дапамагаць людзям, якія маюць патрэбу ў гэтым, з дапамогай пластыкавых накрывак.**

У Беларусі зараз жывуць амаль 565 тысяч дзяцей і дарослых, якія маюць інваліднасць. Не ўсім з іх хапае дзяржаўнага фінансавання на лячэнне і рэабілітацыю. Прывядзём яшчэ некалькі лічбаў, якія на першы погляд не маюць дачынення да праблем людзей з інваліднасцю: на мінскіх звалках за год назапашваецца больш за 800 тон пластыкавых накрывак ад бутэлек з-пад напояў, бытавых парфумерыі і хіміі. А ва ўсёй краіне штогод на звалках збіраецца каля 4 тысяч тон такіх накрывак — агульным коштам больш за $800 000. Арганізатары праекта «Новае жыццё ў абмен на накрыўкі» прапануюць усім нам не адпраўляць накрыўкі на звалкі, а збіраць у адмысловыя фірменныя кантэйнеры, устаноўленыя ў гандлёвых цэнтрах, універсітэтах, школах, дзіцячых садках, кафэ, офісах і нават пад'ездах. Пасля збору ўся другасная сыравіна будзе перададзена перапрацоўчым арганізацыям, а за кошт сродкаў, атрыманых ад яе продажу, будуць набыты медыкаменты, медыцынскі інвентар і абсталяванне і перададзены хворым.

«Мы абавязкова будзем асвятляць у СМІ перадачу атрыманых сродкаў у дзіцячыя дамы і людзям з інваліднасцю», — абяцае **адзін з арганізатараў Мікалай ЗАЯЦ.** Акцыя ўжо ахоплівае такія гарады, як Мінск, Ліда, Гомель, Брэст. На дадзены момант, паводле папярэдніх ацэнак, ужо сабрана каля 10 тон накрывак. У найбліжэйшых планах арганізатараў — пашырыць геаграфію збору, таксама яны шукаюць партнёраў, якія пагадзіліся б вырабляць фірменныя кантэйнеры.

**Святлана БУСЬКО.**

## Прававая гасцёўня

# МЯНЯЮЧЫ РАБОТУ, ДУМАЙ ПРА ЎЗРОСТ

### Асаблівa калі стаіш у чарзе на жыллё як маладая сям'я

***У 2009 годзе па месцы маёй працы я і жонка як асобы, якія ўпершыню пабраліся шлюбам, былі прынятыя на ўлік грамадзян, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Мы жывём разам з цешчай у двухпакаёвай кватэры агульнай плошчай 49 м². У снежні 2017-га я пераводам уладкаваўся на новае месца працы. Я падаваў заяву аб пастаноўцы на ўлік грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў... Але мне адмовілі, паколькі нам з жонкай споўнілася па 32 гады. Маёмасны стан маёй сям'і з 2009 года не змяніўся. Ці правамерна мне адмовілі на новым месцы працы?***

**Сяргей А.,** *г. Мінск*



На пытанне адказвае **Святлана ПАЎЛЮЧЭНКАВА, кансультант упраўлення прававога рэгулявання сацыяльнай дзейнасці дзяржавы галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі:**

— На жаль, так. На новым месцы працы вас з жонкай не маглі прыняць на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у якасці маладой сям'і, паколькі пры пастаноўцы на ўлік з гэтай прычыны ўлічваецца не толькі маёмасны стан, а і ўзрост. Па законе, хоць бы адзін з сужэнцаў павінен быць не старэй за 31 год, каб лічыцца маладой сям'ёй.

Пытанні ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, урэгуляваны Палажэннем аб уліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і аб парадку выдзялення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду. Гэты дакумент зацверджаны Указам Прэзідэнта Беларусі ад 16 снежня 2013 года № 563 «Аб некаторых пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін».

Пры пераводзе грамадзяніна, які стаіць на ўліку асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, на работу ў іншую арганізацыю ён прымаецца на ўлік па новым месцы працы з часу пастаноўкі яго на ўлік на мінулым месцы. Пры гэтым арганізацыя па новым месцы працы запытвае ва ўстаноўленым парадку з мінулай работы чалавека яго ўліковую справу.

На новым месцы грамадзяніна прымаюць на ўлік як асобу, якая мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, пры наяўнасці ў яго падстаў для гэтага, якія пералічаны ў пункце 3 Палажэння і дзейнічаюць на дату падачы заявы. Падаць заяву на ўлік на новым месцы працы неабходна не пазней за шэсць месяцаў з пачатку работы.

На мінулым месцы працы вы з жонкай стаялі на ўліку асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, як грамадзяне, якія ўпершыню пабраліся шлюбам і не маюць асобнага жылля ва ўласнасці. У сувязі з пераводам на работу ў іншую арганізацыю на папярэднім месцы вас знялі з уліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Цяпер, каб прыняць вас на ўлік на новай рабоце як маладую сям'ю, трэба адпавядаць адразу некалькім умовам. Згодна са зменамі ў заканадаўстве, узрост хоць бы аднаго з сужэнцаў павінен быць менш за 31 год. Неабходна, каб для абодвух гэта быў першы шлюб. Ні ў мужа, ні ў жонкі не павінна быць ва ўласнасці жылля і (або) ніводзін з іх не можа быць наймальнікам жылля па дагаворы найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду, займаць аб'ект долевага будаўніцтва па дагаворы найму, арэнды, бязвыплатнага карыстання ці іншым дагаворы.

Такім чынам у вашым выпадку на момант пастаноўкі вас на ўлік на новым месцы працы змяніліся крытэрыі, згодна з якімі вы раней лічыліся асобамі, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Таму вас і не маглі прыняць на ўлік як маладую сям'ю.

Калі ў вас з'явяцца іншыя падставы для прызнання асобамі, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадугледжаныя пунктам 3 Палажэння, пытанне аб прыняцці на ўлік будзе разгледжана пры ўмове прадстаўлення дакументаў, якія пацвярджаюць гэтую магчымасць, з даты падачы заявы аб пастаноўцы на такі ўлік.

**Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых ведамстваў мы будзем шукаць на іх адказы.**